БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. №

# КУЛЬТУРА

ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ "ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ"

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 49 (1384)
8 снежня 2018 г.



Народны артыст Беларусі адсвяткаваў залаты юбілей сваёй творчай дзейнасці. Гэта чалавек, чыя энергія зараджае многіх. Мы з ім пасябравалі з першага погляду. Памятаю, на рэпетыцыі мне спатрэбіўся здымак для газеты ў нацыянальных касцюмах.

Фота Юрыя ІВАНОВА

# Неўтаймоўны імпэт Дрынеўскага

— Добра, — сказаў Міхаіл Паўлавіч. — Пачакайце пару хвілін.

Той каскад ласкавых слоў, якія ён абрынуў на сваіх падапечных, якія не збіраліся пераапранацца ў канцэртную вопратку, варта было б занатаваць.

І ўсё гэта з сакавітымі прымаўкамі, якія ён ахвотна сачыняе і дэкламуе. Сапраўдны Народны артыст!

І вось літаральна праз некалькі хвілін перада мной стаяў ансамбль у прыгожых строях.

Мне як фатографу не спатрэбілася шмат высілкаў, каб выбудаваць кампазіцыю здымка. Цэнтральнае месца заняў кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча Міхаіл Дрынеўскі.

І фота зайграла ўсімі фарбамі вясёлкі.

Напярэдадні юбілейнага канцэрта ў філармоніі я патэлефанаваў Міхаілу Паўлавічу. Ён адказаў адразу.

— Я дома, сяджу на кухні, падпісваю квіткі сваім гасцям.

— Не той імпэт, не той запал... — нагадаў я яму радок з яго прымаўкі, якую ён цалкам агучвае толькі сябрам.

І пачуўшы ў адказ зараздівы смех Дрынеўскага, зразумеў, што з імпэтам і запалам у яго — усё ў норме.

І прыгадаліся мне словы Максіма Горкага: "Так смяяцца можа толькі шчыры чалавек!"

Юрый ІВАНОЎ

Працяг — на старонцы 3.

Соцыум

## ВЕЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ ЎТАПІЧНЫХ ІДЭЙ



Ці з'явіцца ў Вілейцы помнік авангардысту Уладзіславу Стрэмінскаму? Адказвае "К".

ст. 4 — 5

118: ідэі, асобы, намеры

## ПАКУЛЬ "ЦІК-ТАКАЕ" ГАДЗІННІК



Кінематычная батлейка ды іншыя адметнасці Койданаўшчыны — "К" піша, чым уразілася падчас апошняй паездкі ў рэгіёны.

ст. 10 — 11

Раскадроўка

## У ПАМКНЕННІ ДА НЕБА



"К" распачынае серыю публікацый кінарэжысёра Уладзіміра Арлова, героямі якіх сталі вандроўнік Фёдар Конюхаў і ксёндз Уладзіслаў Завальнюк — іх аб'яднала лётная справа.

ст. 15

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ


Фота Ганны ШАРКО


Фота Юрыя ІВАНОВА

# Неўтаймоўны імпэт Дрынеўскага

*(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)*

**50-годдзе сваёй творчай дзейнасці Міхаіл Дрынеўскі адзначыў вялікім і яркім канцэртам таго знакамітага калектыву, якім ён кіруе ўжо больш за 40 гадоў — Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча. Зразумела, у той вечар са сцэны Белдзяржфілармоніі гучалі не толькі песні, але і шматлікія словы падзякі юбіляру. І сапраўды, калегі выказваюцца пра гэтую асобу нязменна добра. Пра што сведчыць і падборка “віншавальных адрасоў”, якія агучылі праз нашы старонкі тыя, хто шануе дзейнасць мэтра.**

### “ЗА ЯГО НАМ ТРЭБА ДЗЯКАВАЦЬ БОГУ”

**Міхаіл КАЗІНЕЦ, народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя Іосіфа Жыновіча:**

— Я лічу, што за такога музыканта, як Міхаіл Дрынеўскі, мы павінны несупынна дзякаваць нашай зямлі і Богу. Вельмі мудры чалавек — народны артыст СССР Генадзь Цітовіч — у свой час змог убачыць, разгледзець талент маладога харавіка, падтрымаць яго на пачатку прафесійнай дзейнасці.

Міхаіл Дрынеўскі працягнуў — і працягвае! — развіваць традыцыі, закладзеныя заснавальнікам легендарнага хору. Думаю, што пад ягоным кіраўніцтвам гэты калектыў дасягнуў новых вышыняў. Поспехі ў галіне харавога мастацтва, папулярызацыя беларускай нацыянальнай культуры, высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства — усяго гэтага Нацыянальны акадэмічны народны хор дабіўся дзякуючы таму, што яго ўзначальвае вялікі музыкант Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі.

### ПАЧУЦЦЁ АКАДЭМІЧНАГА ГУСТУ

**Алег ЕЛІСЕЕНКАЎ, кампазітар, выканаўца, дацэнт кафедры мастацтва эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:**

— Я пачуў яго імя яшчэ, пэўна, у дашкольным веку. Справа ў тым, што мой тата і тады яшчэ Міша, Міхась, вучыліся разам у кансерваторыі ў аднаго педагога. І бацька ўжо тады — я чамусьці гэта добра памятаю — адгукаўся пра свайго прыяцеля з павагай, нават з нейкім піетэтам. І калі праз шмат гадоў ужо не Міша, а Міхаіл Паўлавіч узначаліў наш самы галоўны народны хор, тата пастаянна казаў самыя цёплыя словы ў дачыненні да гэтага чалавека і ганарыўся тым, што з’яўляўся яго аднакашнікам.

Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі — гэта сапраўднае ўвасабленне нашага беларускага Палесся. Свай творчасцю ён апавядае пра нас, беларусаў — народ са сваёй магутнай гісторыяй і культурай. Гэта прафесіянал найвышэйшай пробы. У ім дасканала развітае пачуццё акадэмічнага густу, наяўнасць якога абавязковая для таго жанру, якому ён прысвяціў сваё жыццё. Развіўшы і гэты густ, ён змогператварыць жанр харавой музыкі ў высокае філарманічнае мастацтва.

З круглай датай вас, Міхаіл Паўлавіч! Бязмерна паважаю вас і схіляюся перад вашым талентам!

### “А ЯШЧЭ І ЭТНОГРАФ ДЫ ПАПУЛЯРЫЗАТАР”

**Алег ХАМЕНКА, лідар гурта “Палац”:**

— Вядома, гэта няпроста — працягваць тую велізарную, важную справу, якой служылі Генадзь Цітовіч і Віктар Роўда — вялікія беларускія харавікі. І Міхаіл Паўлавіч належна гэта робіць. Можа, дзесьці часам і дапускаючы хібы, і трапляючы пад крытыку — але заўсёды сумленна, заўсёды да канца аддаючыся сваёй працы.

Гаворачы аб Дрынеўскім, мы — абывацелі, хто сёе-тое ведае пра музыку — асноўнай яго заслугай лічым служэнне харавому мастацтву. І пры гэтым часам забываем, што Міхаіл Паўлавіч — яшчэ і этнограф, і фалькларыст з імем, і даследчык ды папулярызатар песень з народу, з глыбінкі. Наколькі я ведаю, сваю малую радзіму, гістарычную Тураўшчыну, тое мястэчка Тонеж, дзе ён з’явіўся на свет, у гэтым сэнсе ён даследаваў “ад і да”. І многія, многія гэтыя знаходкі Дрынеўскі перанёс у свой хор — апрацаваўшы, даў ім новае жыццё.

Міхаіл Паўлавіч — гэта чалавек, бязмежна закаханы ў сваю прафесію, у беларускае вакальнае мастацтва, у беларускую культуру наогул. Я не аматар высокіх слоў, але ўсё-такі скажу, што на такіх, як ён, талентах і фанатыках і трымаецца беларуская зямля. Ад імя ўсіх сваіх калегаў — музыкантаў-фалькларыстаў — віншую мэтра!

### АКАРДЭОН, ВЫШЫВАНКА, ЧАМАДАНЧЫК...

**Тамара ПРЫБАЛАВЕЦ, дырэктар Тонежскага сельскага дома культуры:**

— Калі ў 1970 годзе я прыехала з Петрыкава ў Тонеж працаваць у клубе, Міхаіл Паўлавіч ужо працаваў у Мінску. Але новыя сяброўкі мне шмат чаго распавялі пра гэтага таленавітага чалавека. А калі пазнаёмілася з ім асабіста, на ўласныя вочы і вушы пераканалася: Дрынеўскі з тых, хто да драбніц ведае ўсё пра народныя спевы.

Менавіта ён, як я даведалася, хор заснаваў у Тонежы. У музейным пакойчыку пры клубе, які мы стварылі пасля смерці бацькоў Міхаіла Паўлавіча, ёсць фотаздымак дзе Дрынеўскі выступае са сваім калектывам ва ўрочышчы Громаш. Ужо тады слава пра яго грымела...

Дык вось, у тым музейным пакойчыку, апрача шматлікіх грамат, лістоў і фотаздымкаў, ёсць нават чамаданчык, з якім будучы народны артыст у школу хадзіў, што ў вёсцы Букча знаходзілася. Ёсць сярод экспанатаў і першы акардэон, першы гармонік Дрынеўскага. Нават вышыванка захавалася, у якой ён пачаў выступаць на сцэне.

Я па прыкладзе маэстра стварыла свой вакальны гурт “Таняжанка”. Дарэчы, на першым раённым фестывалі ў гонар Міхаіла Дрынеўскага мы Гран-пры ўзялі...

Ён калі прыязджае на малую радзіму, дык заўжды ў СДК завітае, заўжды слушную параду нашым вакалістам дае, ніколі слова добрага не пашкадуе, каб сваю павагу выказаць самадзейным артыстам. З 50-годдзем творчай дзейнасці вас, любы Міхаіл Паўлавіч!

**Падрыхтавалі Алег КЛІМАЎ, Яўген РАГІН і Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ**

К

---

**У Вялікім тэатры — святочны зімовы марафон у тэмпе спрынта. 13 снежня адкрыецца IX Мінскі міжнародны Калядны оперны форум — між іншым, прэм’ерай, што заўжды патрабуе шмат высілкаў. Паралельна будзе праходзіць і V Мінскі міжнародны Калядны конкурс вакалістаў. Але оперу апярэдзіў балет. Днямі, а менавіта 5 і 6 снежня, адбылася прэм’ера новай аўтарскай рэдакцыі “Рамэа і Джульеты” ў пастаноўцы Валянціна Елізар’ева.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

# У оперным — Каляды

Абноўлены і фармат самага правядзення прэм’ерай вечарыны. Яго адчулі найперш тыя, хто прыйшоў у тэатр за гадзіну раней да пачатку спектакля. Бо ў Камернай зале імя Ларысы Александроўскай вядомы беларускі крытык і даследчык Святлана Уланоўская распавядала пра разнастайныя ранейшыя пастаноўкі “самай сумнай аповесці ў свеце”.

Роўна праз тыдзень пасля балетнай прэм’еры — оперная, якая адкрывае згаданы Калядны форум. “Дон Паскуале” Гаэтана Даніцэці не ўпершыню завітае на нашу сцэну. Але на гэты раз — з амаль цалкам маладзёжным складам выканаўцаў, якім скарыцца гэтая опера-буфа. І ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра Міхаіла Панджавідзэ.

Астатнія спектаклі форума — гэта прэм’еры мінулага і пачатку гэтага сезона: “Тоска”, “Багема”, “Саламея”. Але ў рамках фестывалю яны пройдуць з запрошанымі з замежжа зоркамі. Упершыню замест гасцявога спектакля адбудзецца сольны канцэрт адной з самых запатрабаваных у свеце спявачак — Вольгі Перацяцька. Але, як запэўніў падчас прэс-канферэнцыі генеральны дырэктар тэатра Уладзімір Грыдзюшка, гэта не стане завядзёнкай: на наступных форумах можна будзе ўбачыць паўнавартасныя спектаклі іншых тэатраў, што вельмі важна для развіцця айчыннага мастацтва. Затое захаваецца іншая традыцыя: як заўжды, завяршыцца свята маштабным гала-канцэртам. У ім побач з прызнанымі артыстамі выступяць таксама пераможцы конкурсу.

Дарэчы, сёлета на гэтае творчае спаборніцтва паступіла рэкордная колькасць заявак — 332 з 26 краін. Колькі канкурсантаў да нас даедзе — убачым ужо на тым тыдні. Адбор будзе, як звычайна, жорсткім: фіналісты павінны не толькі праспяваць, але і акцёрскі сыграць адну з прапанаваных конкурснай праграмай оперных сцэн.

К